# АЎЧЫННІКАВА Екацярына Сямёнаўна

## Калгасніца-даярка калгаса „Чырвоны маяк“ Баханоўскага сельсовета Хоцімскага раёна—кандыдат у дэпутаты Магілёўскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных па Бярозкаўскай выбарчай акрузе № 99

АЎЧЫННІКАВА Екацярына Сямёнаўна нарадзілася ў 1914 годзе, беларуска, беспартыйная, закончыла 4 класы пачатковай школы.

Да Вялікай Айчыннай вайны на працягу 8 год Е. С. Аўчыннікава працавала ў калгасе на жывёлагадоўчай ферме ў якасці даяркі. У перыяд вайны яна пражывала ў вёсцы Бахаы Хоцімскага раёна і працавала ў сваёй гаспадарцы. Муж яе загінуў на фронце.

З 1944 года тав. Аўчыннікава Е. С. працуе даяркай калгаса «Чырвоны маяк», добрасумленна выконвае свае абавязкі. У 1954 годзе ад 12 замацаваных за ёю кароў яна дабілася вышэй планавага надоя малака—1015 літраў малака ад кожнай каровы. Тав. Аўчыннікава добра арганізавала зімоўку жывёлы, укладвае многа працы для дасягнення больш высокай прадуктыўнасці кароў, рацыянальна выкарыстоўвае кармы, здабрывае іх.



У калгасе ўсе бачаць добрую работу даяркі Аўчыннікавай і калі ўзнікла пытанне, каго паслаць у Маскву на сельскагаспадарчую выстаўку, калгаснікі ў адзін голас сказалі: Екацярыну Сямёнаўну. Там у якасці экскурсанткі тав. Аўчыннікава азнаёмілася з перадавымі метадамі працы ў жывёлагадоўлі. Зараз Екацярына Сямёнаўна прыкладае многа намаганняў і старання для ўнядрэння ў калгасную вытворчасць перадавых метадаў па кармленню і догляду за жывёлай, дабіваецца таго, каб у1955 годзе падвоіць надоі малака ад кожнай каровы.

Перадавая калгасніца, лепшая даярка ўдастоілася чэсці быць вылучанай кандыдатам у дэпутаты Магілёўскага абласнога Совета.

Давер‘е калгаснікаў яна апраўдае.

Аўчыннікава Екацярына Сямёнаўна, калгасніца-даярка калгаса “Чырвоны маяк” Баханоўскага сельсовета Хоцімскага раёна — кандыдат у дэпутаты Магілёўскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных па Бярозкаўскай выбарчай акрузе № 99 // Шлях Кастрычніка.